Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 14. Варыянт 1**

**Білет 14. Практычнае заданне. Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі.**

**Заданне склала:** настаўнік Хіневіч М.Г., ДУА «Сеўрукоўская базавая школа Баранавіцкага раёна»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Як называўся дакумент, які вызначаў намеры нацысцкай Германіі адносна завяяваных тэрыторый Усходняй Еўропы?
2. Пацвердзіце цытатамі з крыніц сцвярджэнне: "Фашысты планавалі каланізацыю Беларусі на аснове расавай дактрыны".
3. Якія дзеянні, учыненыя нацысцкімі злачынцамі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, з'яўляюцца генацыдам беларускага народа? Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі з крыніц.
4. Якія факты ў прыведзеных крыніцах пацвярджаюць, што Вялікая Перамога захавала беларускі народ і дала нам права жыць, жыць свабодна на роднай зямлі?

**Крыніца 1**

З заўваг і прапаноў Э. Ветцеля па генеральным плане "Ост". 27 красавіка 1942 г.

Генеральны план "Ост" прадугледжвае, што пасля заканчэння вайны колькасць перасяленцаў для неадкладнай каланізацыі ўсходніх тэрыторый павінна складаць <…> 4550 тыс. чал. Гэты лік не здаецца мне занадта вялікім, улічваючы перыяд каланізацыі, роўны 30 гадам. Цалкам магчыма, што яно магло б быць і болей. Бо трэба мець на ўвазе, што гэтыя 4550 тыс. немцаў павінны быць размеркаваны на такіх тэрыторыях, як вобласць Данцыг - Заходняя Прусія, Вартская вобл., Верхняя Сілезія, генерал-губернатарства, Паўднёва-Усходняя Прусія, Беластоцкая вобл., Прыбалтыка, Інгерманландыя , Беларусь, часткова таксама вобласці Украіны. <…>

в) Да пытання аб беларусах.

Згодна з планам, прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай ім тэрыторыі. Значыць, 25 працэнтаў беларусаў па плане галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягаюць здранцванню <…>.

Непажаданае ў расавых адносінах беларускае насельніцтва будзе яшчэ на працягу многіх гадоў знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым уяўляецца вельмі неабходным па магчымасці больш старанна адабраць

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

беларусаў нардычнага тыпу, прыдатных па расавых прыкметах і палітычных меркаваннях для анямечвання, і адправіць іх у імперыю з мэтай выкарыстання ў якасці працоўнай сілы. Іх можна было б выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы ў якасці сельскагаспадарчых працоўных, а таксама ў прамысловасці, ці як рамеснікаў. Паколькі з імі абыходзіліся б як з немцамі і з прычыны адсутнасці ў іх нацыянальнага пачуцця, яны ў хуткім часе, прынамсі, у найбліжэйшым пакаленні, маглі б быць цалкам анямечаныя [].

**Крыніца 2**

Крупнейшие концентрационные лагеря и места массового уничтожения советских граждан на оккупированной территории Беларуси




**Крыніца 3**

**З даклада Брэсцкай абласной камісіі аб зверскім знішчэнні і ўгоне на катаржныя работы мірнага насельніцтва гітлераўскімі захопнікамі, памерах урону, нанесенага імі народнай гаспадарцы, культуры і грамадзянам вобласці, у перыяд фашысцкай акупацыі з чэрвеня 1941 па ліпень 1944 г.**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

1 сакавіка 1945 г.

I. Злачынствы немцаў у вобласці

За перыяд акупацыі тэрыторыі вобласці нямецка-фашысцкімі захопнікамі забіта і закатавана 159526 мірных савецкіх грамадзян і 38858 ваеннапалонных. Больш за 30 тыс. савецкіх грамадзян сагнана ў нямецкае рабства.

Гітлераўцы на тэрыторыі вобласці арганізавалі месцы масавага знішчэння мірнага насельніцтва (урочышча Бронная Гара Бярозаўскага раёна, дзе расстраляна больш за 50 тыс., савецкіх грамадзян розных узростаў і нацыянальнасцей).

У мяст. Дамачава гітлераўцы 23 верасня 1942 г. Расстралялі ўсіх 54 дзяцей, якія засталіся ў дзіцячым доме, і выхавальніцу Грахольскую. Усяго па вобласці нямецкімі захопнікамі знішчана 44953 дзяцей і падлеткаў...

Немцы ў сваёй звярынай злосці да беларускага народа знішчалі, жывымі спальваючы ў агні, цэлыя сем'і. Так, 17 сакавіка 1943 г. немцамі цалкам спалена в. Зыбайлы Косаўскага раёна. Жывыя людзі цэлымі сем'ямі былі замкнуты ў сваіх дамах і спалены, а той, хто спрабаваў уцякаць, вылоўліваўся і жывым кідаўся ў агонь.

10 верасня 1942 г. карным атрадам СС у Косаўскім раёне была цалкам спалена в. Зацішша. Усіх жыхароў вёскі гітлераўцы сагналі ў адну адрыну, замкнулі яе і падпалілі. І ўсё насельніцтва ад грудных дзяцей да глыбокіх старых загінула ў агні.

На падставе праведзеных расследаванняў камісіяй улічана, што гітлераўцамі ў Брэсцкай вобл. спалена 949 чал. мірных савецкіх грамадзян, у тым ліку больш за 300 чал. дзяцей.

У працоўным пасёлку Тамашоўка Дамачаўскага раёна фашысты стварылі гета, куды сагналі ўсё яўрэйскае насельніцтва ў колькасці больш за 2 тыс. чал., а ў канцы ліпеня 1942 г. нямецкія каты зрабілі масавае знішчэнне насельніцтва гета. На працягу 4 дзён немцы атручвалі газамі і расстрэльвалі ўсё насельніцтва, якое знаходзілася ў гета.

Хворых, змучаных катаржнай працай і ўмовамі жыцця ў Нямеччыне немцы вывозілі з Нямеччыны і змяшчалі ў лагер. Адзін з такіх лагераў быў арганізаваны немцамі на тэрыторыі Брэсцкага раёна паблізу дэр. Рэчыца, дзе ў пачатку 1943 г. была змешчана вялікая колькасць хворых. Рэжым у лагерах нічым не адрозніваўся ад нямецкіх лагераў для ваеннапалонных. Людзей трымалі за падвойным плотам [пз] калючага дроту. За спробу выбрацца з лагера шмат хто быў расстраляны.

**Адказы на заданні і каментарыі**

1. Генеральны план "Ост".
2. «Непажаданае ў расавых адносінах беларускае насельніцтва…»

«…уяўляецца вельмі неабходным па магчымасці больш старанна адабраць беларусаў нардычнага тыпу, прыдатных па расавых прыкметах і палітычных

меркаваннях для анямечвання» (дзяленне людзей на прыдатных і непажаданых па расавай прыкмеце – адна з прыкмет расавай тэорыі)

3. Пад генацыдам разумеюць дзеянні, якія здзяйсняюцца з намерам знішчыць поўнасцю або часткова якую-небудзь нацыянальную, этнічную, расавую або рэлігійную групу людзей.

Фашысты на акупаванай тэрыторыі Беларусі праводзілі мэтанакіраваную палітыку па масавым знішчэнні насельніцтва. Пра гэта сведчыць канцэнтрацыйныя лагеры і гета, створаныя на тэрыторыі Беларусі; колькасць знішчаных у іх людзей; спаленне вёсак разам з людзьмі.

4. У планах фашыстаў было:

- выселіць 75 працэнтаў беларускага насельніцтва;
- 25 працэнтаў насельніцтва анямечыць, накіраваць іх на працу ў імперыю і выкарыстоўваць у якасці рабочай сілы (сельскагаспадарчых або прамысловых рабочых, рамеснікаў);
- мэтанакіравана праводзілі палітыку масавага знішчэння насельніцтва Беларусі. Да месцаў найбольш масавага знішчэння людзей на акупаванай тэрыторыі Беларусі адносяцца Трасцянец, Мінскае гета, Лясная.
- засяліць тэрыторыю Беларусі нямецкімі перасяленцамі.

Планы гітлераўцаў і іх дзеянні на акупаванай тэрыторыі Беларусі былі несумяшчальныя з існаваннем беларускага народа